2017 m. pagrindinio ugdymo pasiekimų patikrinimo užduotis
Праверачнае заданне за курс базавай школы (2017 г.)

# GIMTOJI KALBA (BALTARUSIŲ)

## БЕЛАРУСКАЯ МОВА

**Rašymas / Сачыненне**

Pagrindinė sesija / Асноўная сесія

24 мая 2017 г. Час – 2,5 гадзіны

**ТЛУМАЧЭННІ**

- З трох прапанаваных заданняў выбярыце адно і выканайце яго.
- Ваш тэкст павінен быць аб'ёмам 250–350 слоў (прыблізна 1–1,5 старонкі фармата А4).
- Пасля таго, як работа будзе напісана, палічыце і напішыце прыблізную колькасць слоў у ёй (самастойных і службовых часцін мовы). Для гэтага вылічыце сярэдняе арыфметычнае колькасці слоў у першых пяці радках і атрыманую лічбу памножце на колькасць радкоў у вашай рабоце.
- Для чарнавіка і чыставіка выкарыстайце пазначаныя школьнай пячаткай аркушы. Не забудзьце напісаць сваё прозвішча, імя, жанр і адрасата пісьмовай работы.
- Пішыце выразна, разборліва, ручкай сіняга колеру. Ужываць карэктар забараняецца.
- Пасля заканчэння працы аддайце настаўніку і чыставік, і чарнавік. Чарнавік не правяраецца.

Жадаем поспеху!

© Nacionalinis egzaminų centras, 2017 m.

***Уважліва прачытайце ўсе тры заданні і выканайце адно з іх: напішыце альбо артыкул, альбо ліст, альбо сачыненне-разважанне.***

## I заданне

У 16-м стагоддзі ў прадмове да кнігі “Юдзіф” Ф. Скарына пісаў: “Як ад нараджэння звяры, што ходзяць у пустыні, ведаюць ямы свае; птушкі, што лётаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, што плаваюць па моры і ў рэках, чуюць віры свае; пчолы і тым падобныя бароняць вуллі свае, – так і людзі, дзе нарадзіліся і ўскормлены, да таго месца вялікую ласку маюць”. Як ты думаеш, ці актуальныя гэтыя словы сёння, у эпоху глабалізацыі, калі ў кожнага чалавека ёсць магчымасць паехаць туды, дзе яму будзе жыць лягчэй, цікавей, спакайней? Ці большую павагу выклікае той, хто, нягледзячы на жыццёвыя складанасці, застаецца на сваёй Радзіме і імкнецца прынесці ёй карысць? А, магчыма, з’язджаюць ці застаюцца і па іншых прычынах?

Напішы ў газету артыкул, у якім выкажы свае думкі на гэтую тэму. Не забудзь прыдумаць цікавую назву артыкула.

**Жанр** – артыкул у газету

**Адрасат** – рознаўзроставая аўдыторыя

## II заданне

Як гэта важна – умець адмаўляцца ад таго, што табе зусім не патрэбна, умець сказаць іншаму чалавеку “не”. Напрыклад, сяброўка запрашае цябе пагуляць, а ў цябе свае планы на вечар. Ці знаёмы ўгаворвае пакурыць, а ты катэгарычна супраць. Прыкладаў, калі ёсць нагода сказаць “не”, мноства, але чаму нам так складана гэта зрабіць? Уяві, што ты атрымаў ліст ад сябра, які сам пакутуе ад такой праблемы і просіць у цябе парады.

Напішы ліст, у якім выкажы свае адносіны да гэтай праблемы, парай, як, на тваю думку, варта было б паводзіць сябе ў падобных сітуацыях.

**Жанр** – ліст сябру

**Адрасат** – твой равеснік

## III заданне

> Адна з чытачак часопіса “Маладосць” напісала: “Сучасную моладзь называюць пакаленнем next. Next у перакладзе з англійскай мовы азначае наступны. Я згодна з гэтай назвай. Наша пакаленне ідзе наперад, таму нашы ідэалы адрозніваюцца ад бацькоўскіх. У мінулым стагоддзі моладзь жадала паходзіць на славутых гістарычных дзеячаў, адважных кніжных герояў, сваіх настаўнікаў. А цяпер мы не жадаем быць падобнымі на каго-небудзь… Мы шануем індывідуальнасць. Галоўнае – застацца самім сабою. Перайманне – гэта пустое марнаванне часу”.

Напішы сачыненне-разважанне на тэму “Пакаленне next”. На змешчаныя ніжэй пытанні адказваць неабавязкова, але яны могуць дапамагчы табе пры напісанні сачынення.

Чым тваё пакаленне адрозніваецца ад пакалення тваіх бацькоў? Што значыць “застацца самім сабою”? Ці згодны ты з тым, што “перайманне – гэта пустое марнаванне часу”?

**Жанр** – сачыненне-разважанне

**Адрасат** – твае равеснікі і вашы бацькі